Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія КАДРЫ

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 4 (190) | Аўторак, 9 сакавіка 1954 года | Цана 20 кап.

Вялікі прадаўжальнік справы В. І. Леніна

5 сакавіка наша партыя, совецкі народ і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначылі першую гадавіну з дня смерці Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, вернага вучня і саратніка вялікага Леніна, вялікага прадаўжальніка яго справы. Імя І. В. Сталіна бясконца дорага для совецкіх людзей і працоўных усяго свету.

У труны вялікага заснавальніка Комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы В. І. Леніна І. В. Сталін ад імя партыі і народа даў клятву вернасці яго запаветам — захоўваць адзінства партыі, захоўваць і ўмацоўваць дыктатуру пралетарыята, саюз рабочых і сялян, дружбу народаў, высока трымаць сцяг пролетарскага інтэрнацыяналізма. Гэтым запаветам І. В. Сталін заставаўся верным да канца свайго жыцця. Ён ва ўсім следаваў Леніну, заклікаў совецкіх людзей па-ленінску жыць і працаваць, змагацца і перамагаць ворагаў, унутраных і знешніх. Комуністычная партыя пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта на чале з І. В. Сталіным разграміла здраднікаў і капітулянтаў, адстаяла ленінізм і павяла краіну па шляху пабудовы соцыялізма.

Зыходзячы з праграмных ленінскіх палажэнняў, якія атрымалі далейшае развіццё ў працах І. В. Сталіна і ў партыйных рашэннях, партыя распрацавала канкрэтную праграму соцыялістычнай індустрыялізацыі краіны. Ажыццяўленне плана індустрыялізацыі забяспечыла эканамічную незалежнасць нашай Радзімы, узмацніла яе абароназдольнасць, стварыла матэрыяльную базу соцыялізма і будаўніцтва комунізма.

Ажыццяўляючы запаветы В. І. Леніна, І. В. Сталін няспынна працаваў над стварэннем непарушнай дружбы брацкіх совецкіх народаў. На аснове абагульнення вопыта будаўніцтва соцыялістычнай шматнацыянальнай дзяржавы І. В. Сталін узбагаціў вучэнне ленінізма па нацыянальнаму пытанню.

Творча развіваючы ленінскае вучэнне аб магчымасці перамогі соцыялізма ў адной краіне, І. В. Сталін абаснаваў палажэнне аб магчымасці пабудовы комунізма ў нашай краіне і ў тым вышадку, калі захаваецца капіталістычнае акружэнне.

Да канца свайго жыцця І. В. Сталін заставаўся на баявым посту па кіраўніцтву партыяй і краінай, па згуртаванню ўсіх прыхільнікаў міру ў барацьбе супраць падпальшчыкаў вайны, за захаванне і забеспячэнне міру.

Пасля смерці свайго правадыра совецкі народ яшчэ цясней згуртаваўся пад сцягам Леніна, вакол Цэнтральнага Камітэта КПСС і Совецкага ўрада. За прайшоўшы год партыя і працоўныя нашай краіны з новай сілай прадэманстравалі сваю вернасць справе Леніна—Сталіна, сваю рашучасць дабівацца новых поспехаў у комуністычным будаўніцтве.

Комуністычная партыя і Совецкі ўрад нястомна мабілізуюць творчую актыўнасць працоўных на паспяховае будаўніцтва комунізма. Совецкія людзі настойліва праводзяць ў жыццё гістарычныя рашэнні вераснёўскага Пленума ЦК КПСС, наследуючыя рашэнні партыі і ўрада, якія намецілі баявую, канкрэтную праграму паскоранага развіцця лёгкай і харчовай прамысловасці і ўсіх галін сельскай гаспадаркі, у першую чаргу жывёлагадоўлі, вытворчасці бульбы і гародніны. Вялікую ўвагу партыя і ўрад удзяляюць асваенню цалінных і абложных зямель, як важнейшаму рэзерву павелічэння вытворчасці збожжа.

Цяпер наша Радзіма перажывае новы працоўны і палітычны ўздым, выкліканы падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Зваротам ЦК КПСС да ўсіх выбаршчыкаў. У выбарчай кампаніі партыя выступае ў блоку з усімі беспартыйнымі, які выражае непарушнае адзінства партыі, урада і народа, маральна-палітычнае адзінства совецкага грамадства.

Пад сцягам Леніна—Сталіна, пад мудрым кіраўніцтвам Комуністычнай партыі совецкі народ упэўнена ідзе да светлай будучыні — комунізма.

МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

Шырокім упэўненым поступам ідзе совецкі народ уперад—да комунізма. З кожным новым працоўным дасягненнем, з кожным новым навуковым адкрыццём набліжаецца гэтае светлае будучае.

Велізарны ўклад у агульную справу ўмацавання магутнасці нашай совецкай дзяржавы ўносяць совецкія жанчыны. Соцыялістычны лад раскаваў путы прыгнёту і нераўнапраўя, якія вякамі няволілі жанчыну, не дазвалялі ёй узняцца ва ўвесь рост, праявіць свае багатыя таленты.

Комуністычная партыя паўсядзённа выхоўвае жанчын, узнімае іх шматмільённыя масы на творчую працу ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі, культуры. Совецкія жанчыны паспяхова выступаюць ініцыятарамі перадавых метадаў працы ў прамысловасці, вырошчваюць высокія ўраджаі на калгасных палях, авалодваюць дасягненнямі навукі і тэхнікі.

Совецкая дзяржава высока цэніць самаадданую працу жанчын-патрыётак. За выдатныя заслугі перад Радзімай 2 346 жанчынам прысвоены званні Герояў Совецкага Саюза і Герояў Соцыялістычнай Працы. За выдатныя працы ў галіне навукі, вынаходніцтва, літаратуры і мастацтва 741 жанчына ўдастоена Сталінскай прэміі. Каля 900 тысяч жанчын—дзеячоў навукі, культуры, перадавікоў і наватараў прамысловасці і сельскай гаспадаркі—узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР.

Разняволіўшы жанчыну, совецкі лад і Комуністычная партыя вывелі яе на шырокі шлях грамадска-палітычнай дзейнасці. Сотні тысяч жанчын паказалі сябе выдатнымі дзяржаўнымі дзеячамі. На падыходзячых выбарах у Вярхоўны Совет СССР кандыдатамі ў дэпутаты вылучаны сотні лепшых дачок совецкага народа.

У абстаноўцы магутнага вытворчага і палітычнага ўздыму, усенароднай барацьбы Совецкага Саюза за аслабленне міжнароднай напружанасці і прадухіленне новай вайны, за мір паміж народамі адзначае ў гэтым годзе совецкі народ Міжнародны жаночы дзень—8 сакавіка. Новымі поспехамі ў справе будаўніцтва соцыялізма, у павышэнні добрабыту народа адзначаюць 8 сакавіка жанчыны краін народнай дэмакратыі.

У абстаноўцы ўзмацняючайся эксплуатацыі, зніжэння жыццёвага ўзроўню працоўных сустракаюць гэты дзень жанчыны капіталістычных краін. Капіталістычныя гаспадары гэтых краін жадаюць развязаць новую вайну, пагнаць на новую бойню іх мужэй, сыноў, братоў. У імя шчасця дзяцей, у імя шчасця будучага чалавецтва аб'едноўваюцца жанчыны ўсіх краін, уздымаюць свой голас у абарону міру супраць новай вайны.

У авангардзе міжнароднага жаночага руху ідуць совецкія жанчыны. У іх жанчыны ўсяго свету вучацца таму, як змагацца за мір, за жыццёвыя інтарэсы, спадзяванні і імкненні.

Вялікай заваёвай соцыялізма з'яўляецца ўсеагульнае навучанне. У нашай краіне для жанчын створаны ўсе магчымасці для авалодання навукай і культурай. Больш мільёна трохсот тысяч жанчын вучыцца ў вышэйшых і спецыяльных сярэдніх навучальных установах. У нашым універсітэце навучаюцца 1410 студэнтак і 35 аспірантак. Звыш 40 жанчын вядуць у нас выкладчыцкую работу.

Усім вядомы імёны дацэнта В. Д. Акімавай, у мінулым годзе ўзнагароджанай за сваю выдатную педагагічную і грамадскую дзейнасць ордэнам Леніна, старшага выкладчыка А. М. Базыленка, дацэнтаў В. Ф. Якушка, М. Б. Фрыдман, Е. П. Ерась і многіх іншых. Слаўная сям'я вучоных нашага ўніверсітэта налічвае многа жанчын—маладых кандыдатаў навук. Звыш дзесяці год сумленна працуюць ва універсітэцкай бібліятэцы Р. Г. Любіна, А. А. Эвенчык, О. Л. Ніканава, М. І. Паскрабаева.

З гонарам выконваюць свой абавязак перад партыяй і Радзімай лепшыя студэнткі універсітэта. Агульнай павагай на факультэтах карыстаюцца выдатніцы вучобы Г. Барташэвіч, Р. Маленчанка, Л. Фурсаева, Н. Вакула, В. Каралёва і іншыя. Яны ўмела спалучаюць выдатную вучобу з вялікай грамадскай работай. Дзесяткі і сотні студэнтак актыўна ўдзельнічаюць у гуртках мастацкай самадзейнасці, паспяхова абараняюць спартыўную чэсць універсітэта на гарадскіх, рэспубліканскіх і ўсесаюзных спаборніцтвах.

Кожны год з універсітэта ідуць у школы, на фабрыкі і заводы, у рэдакцыі газет сотні маладых спецыялістак. І ўсюды сваёй самаадданай працай яны дапамагаюць умацаванню магутнасці совецкай Радзімы, пабудове комуністычнага ладу ў нашай краіне.

У Міжнародны жаночы дзень 8 сакавіка Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі Совецкага Саюза выказвае ўпэўненасць у тым, што совецкія жанчыны і надалей будуць ісці ў першых радах будаўнікоў комунізма ў нашай краіне, жадае ім новых працоўных поспехаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі і культуры на карысць і шчасце совецкага народа.

Напярэдадні выбараў

Пятага сакавіка адбыўся чарговы семінар агітатараў. Тав. Маханёк зрабіў даклад «Дружба народаў СССР — крыніца сілы і магутнасці совецкай дзяржавы».

* * *

Днямі на агітпункце праведзен вечар маладых выбаршчыкаў. Быў прачытан даклад «Дасягненні совецкіх спартсменаў на міжнароднай арэне». Пасля даклада адбыліся спартыўныя выступленні і паказан кінофільм.

* * *

Агітатары універсітэта ў гэтыя дні правялі даклады і гутаркі аб жыцці і дзейнасці І. В. Сталіна і Міжнародным жаночым дні.

КАНДЫДАТЫ ЎСЕНАРОДНАГА БЛОКУ КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ

★ ★ ★

МАКСІМ ЗАХАРАВІЧ САБУРАЎ

Максім Захаравіч Сабураў—член Прэзідыума Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Совецкага Саюза, намеснік Старшыні Совета Міністраў СССР, Старшыня Дзяржплана СССР.

М. З. Сабураў нарадзіўся ў 1900 годзе ў горадзе Дружкоўка (Данбас), у сям'і рабочага. Сваю працоўную дзейнасць ён пачаў з 13 год.

У сакавіку 1920 года таварыш Сабураў уступіў у Комуністычную партыю. Ён быў адным з актыўных арганізатараў комсамола ў Дружкоўцы.

У 1921—1923 гадах таварыш Сабураў працаваў адказным сакратаром раённага прафсакратарыята, сакратаром павятовага камітэта комсамола (горад Бахмут) і раённага камітэта комсамола (Канстанцінаўка). Адначасова ён быў членам бюро райкома і павятовага камітэта Комуністычнай партыі (большэвікоў) Украіны. З 1923 па 1926 год таварыш Сабураў вучыўся ў Комуністычным універсітэце імя Свердлова (Масква). Пасля вучобы ва універсітэце да 1928 года працаваў прапагандыстам пропгрупы ЦК ВКП (б) у Славянску, Енакіеве і Канстанцінаўцы (Данбас).

У 1928 годзе Цэнтральны Камітэт ВКП(б) накіраваў таварыша Сабурава на вучобу ў ліку партысячнікаў у Маскоўскі механіка-машынабудаўнічы інстытут імя Баумана.

Пасля заканчэння інстытута, у 1933 годзе, таварыш Сабураў працаваў на адным з заводаў Масквы загадчыкам тэхналагічнага бюро, затым на Краматорскім машынабудаўнічым заводзе імя Сталіна.

У 1937—1938 гадах М. З. Сабураў быў галоўным інжынерам Галоўнага ўпраўлення цяжкага машынабудавання Наркоммаша.

З 1938 года таварыш Сабураў—на рабоце ў Дзяржплане пры Соўнаркоме СССР на розных пасадах, а з сакавіка 1941 года зацверджан Старшынёй Дзяржплана СССР і адначасова намеснікам Старшыні Соўнаркома СССР.

З канца 1944 года па 1946 год таварыш Сабураў выконваў спецыяльныя заданні Дзяржаўнага Камітэта Абароны.

У лютым 1947 года М. З. Сабураў быў назначан намеснікам Старшыні Совета Міністраў і ў 1949 годзе зацверджан Старшынёй Дзяржплана СССР.

У сакавіку 1953 года таварыш Сабураў быў назначан міністрам машынабудавання і ў сувязі з гэтым вызвален ад абавязкаў намесніка Старшыні Совета Міністраў СССР і Старшыні Дзяржплана СССР.

У чэрвені 1953 года таварыш Сабураў назначан Старшынёй Дзяржплана СССР і ў снежні 1953 года—намеснікам Старшыні Совета Міністраў СССР.

На XIX з'ездзе Комуністычнай партыі Совецкага Саюза таварыш Сабураў выбран членам Цэнтральнага Камітэта партыі. У кастрычніку 1952 года выбран членам Прэзідыума ЦК КПСС.

Таварыш Сабураў з'яўляецца дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР і дэпутатам Маскоўскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

За вялікія заслугі перад Радзімай Максім Захаравіч Сабураў узнагароджан трыма ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі: «За абарону Масквы», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 г.», «У памяць 800-годдзя Масквы».

Максім Захаравіч Сабураў — верны сын Комуністычнай партыі, ён аддае ўсе свае сілы вялікай справе будаўніцтва комунізма ў нашай краіне.

М. З. Сабураў зарэгістраван кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР па Мінскай гарадской выбарчай акрузе № 566.

★ ★ ★

Канстанцін Наумавіч ДЛУГАШЭЎСКІ

Канстанцін Наумавіч Длугашэўскі нарадзіўся ў 1905 годзе ў вёсцы Слабада-Кучанка Капыльскага раёна, Мінскай вобласці, у сям'і селяніна. Член КПСС з 1928 года.

З 1937 года тав. К. Н. Длугашэўскі знаходзіцца на совецкай рабоце. Ён быў старшынёй Веткаўскага, затым Жлобінскага райвыканкомаў, а з 1939 года—старшынёй Брэсцкага аблвыканкома.

У гады Вялікай Айчыннай вайны тав. К. Н. Длугашэўскі, знаходзячыся ў радах Совецкай Арміі, актыўна ўдзельнічаў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

З снежня 1945 года тав. К. Н. Длугашэўскі працаваў намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР. З 1946 года ён працуе старшынёй выканкома Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Канстанцін Наумавіч Длугашэўскі—дастойны кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

К. Н. Длугашэўскі зарэгістраван кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР па Мінскай гарадской выбарчай акрузе № 51.



ЖАДАНЫ ГОСЦЬ

Раздаецца стук у дзверы. Паявіўшаяся на парозе жанчына са строгім і заклапочаным тварам пытае:

— Вам каго?

Іры позірку на госцю твар жанчыны святлее, становіцца радасным:

— Аня? Заходзьце, заходзьце, калі ласка.

Наведвальніца ўваходзіць. Ёй добра знаёма ўсё ў гэтай кватэры. І стол з акуратнымі стопкамі кніг, і ўсё абсталяванне, небагатае, але ўтульнае. Яна добра ведае і жыхароў гэтай кватэры, адчувае сябе сярод іх, як у роднай сям'і.

З-за прыадкрытых дзвярэй даносіцца голас:

— Мама, хто гэта?

— Гэта-ж Аня, наш агітатар,—з цёплай ноткай у голасе адказвае жанчына.

— Сядайце, сядайце,— звяртаецца яна да Ані.

— Не, цёця, мне няма калі. Я прышла сказаць, каб вы прышлі ў 31-ю кватэру. Там прастарней і ўсе могуць сабрацца. Я сёння пазнаёмлю вас з біяграфіямі вашых кандыдатаў. Прыходзьце!

— Абавязкова прыдзем. Усе прыдзем. Ды вы-б пасядзелі ў нас,— гаворыць жанчына, бачачы, што агітатар збіраецца ісці.

— Дзякую, пайду.— Яна выходзіць, і праз мінуту чуецца яе стук у другія дзверы.

Мінут праз пятнаццаць у прасторным пакоі сабраліся выбаршчыкі. Тут і работнікі Мінскай чыгункі, і вучні, і хатнія гаспадыні.

Дачакаўшыся, пакуль усе ўселіся, Аня пачынае расказваць аб слаўным шляху таварыша М. З. Сабурава, члена Совецкага ўрада, вернага сына Комуністычнай партыі, вылучанага на Мінскай гарадской акрузе кандыдатам у Совет Саюза. Затым яна знаёміць выбаршчыкаў з біяграфіяй таварыша К. Н. Длугашэўскага — кандыдата ў Совет Нацыянальнасцей.

Калі Аня скончыла, усе некаторы час маўчалі. Затым Макарава, пажылая работніца Мінскай чыгункі, ціха сказала:

— Добрыя ў нас кандыдаты. Дзейнасць таварышаў М. З. Сабурава і К. Н. Длугашэўскага ўсім нам добра вядома. Я перакананa, што ўсе выбаршчыкі з радасцю прагаласуюць за верных сыноў народа.

Усе прысутнічаючыя былі згодны з ёю. Ва ўсіх адна думка,—які цудоўны ў нашай краіне закон—ён дазваляе выбіраць у вышэйшы орган улады дастойных людзей, вядомых усёй краіне сваёй плённай працай на карысць народа.

Пасля гутаркі завязваецца ажыўленая размова на разнастайныя тэмы.

Маладая выбаршчыца Карачэнкава просіць занесці яе ў спіс выбаршчыкаў. Высвятляецца, што яна выязджала на зімовую экзаменацыйную сесію ў інстытут, а пагэтаму не была ўнесена ў спісы.

Аня запісвае прозвішча Карачэнкавай у свой блак-нот, цікавіцца, як прайшла сесія.

— Бабулька, а як ваша здароўе?— пытае яна ў сівавалосай жанчыны з хваравітым бляскам вачэй.

— Папраўляюся, галубка, папраўляюся. У мінулы раз, калі ты была, дык я і падняцца не магла. А цяпер добра. Вось кніжачку мне галубка, прынесла-б пачытаць. А то так ляжаць сумна.

— Добра, бабулька, прынясу. Заўтра-ж і прынясу...

Выбаршчыца Чулкова хоча наведаць універсітэцкі музей.

— Вельмі шкадую, што не пайшла, калі вы прапанавалі,--гаворыць яна. — Калі цяпер можна пабыць?

Аня адказвае, што музей можна наведаць у любы час, але лепш за ўсё ісці калектыўна, групай. Пабываць у музеі згадзіліся і некаторыя іншыя выбаршчыкі. Аня назначае час, калі яны змогуць наведаць музей.

Любяць выбаршчыкі свайго агітатара Аню Мельнікаву. У кожнай кватэры чакаюць яе з нецярпеннем і рады ёй як жаданаму госцю. Аня чула адносіцца да запатрабаванняў выбаршчыкаў, і яны не саромяцца падзяліцца з ёй сваімі жаданнямі і інтарэсамі.

Аня вельмі часта бывае на сваім участку. Гутаркі, праведзеныя ёю з выбаршчыкамі, вельмі разнастайныя па тэматыцы. З вялікай цікавасцю слухалі яны яе даклады «Совецкая выбарчая сістэма — самая дэмакратычная ў свеце» і «Аб непарыўным адзінстве партыі і ўрада з народам». А за гутарку па кнізе Е. Уруймагавай «Навстречу жизни» выбаршчыкі горача дзякавалі Аню.

Так, умела спалучаючы грамадскую работу з вучобай, А. Мельнікава робіць вялікую і важную справу.

А. ІЎЧЭНКАЎ.

ХРОНІКА

На адбыўшайся 25 люта[illegible]а гарадской нарадзе грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку і работніка[illegible] бок[illegible] адзначана работа універсітэт[illegible] па асваенню падпіскі на газеты часопісы ў апошнім квартале 195[illegible] года.

Лепшыя распаўсюджвальнікі др[illegible]ку ва універсітэце—Г. Арцюшэўс[illegible] (хімфак), Н. Вакула (біяфак), Т. Г[illegible]зава (гістфак) прэміраваны поўг[illegible]довай падпіскай на часопіс «Мал[illegible]досць».

* * *

Днямі адбылося пасяджанне прэ[illegible]цыума рэспубліканскага совета Д[illegible] «Навука», на якім разглядаліся п[illegible]танні настаноўкі фізкультурнай р[illegible]боты ў вышэйшых навучальн[illegible] установах горада за 1953 год.

Рашэннем прэзідыума наша[illegible] універсітэту прысуджаны перш[illegible] месца і вымпел рэспубліканска[illegible] Совета.

У чацвер у спартыўнай зале [illegible]версітэта адбыліся першыя [illegible] круглагадовай спартакіяды па [illegible]лейболу. У спаборніцтвах прын[illegible]ўдзел мужчынскія і жаночыя кам[illegible]ды ўсіх факультэтаў. Усяго бы[illegible] праведзена 8 іграў.

ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ ЖАНЧЫНАМ УНІВЕРСІТЭТА!

★ ★ ★

На здымку: лепшыя студэнткі універсітэта. У першым радзе: А. Каралёва, Н. Капціловіч, І. Кісялёва, І. Подзіна, І. Буракова, С. Аленіцкая, Н. Котава. У другім радзе: Р. Маленчанка, Н. Вакула, І. Казлоўская, А. Пужэнкова, Е. Паповіч, Ю. Цярэнцьева.

Фота Р. ЯСІНСКАГА і Б. БРЭЙВО.

Энтузіясты бібліятэчнай справы

Здаецца, яшчэ зусім нядаўна наш універсітэт працаваў на станцыі Сходня і старэйшыя работнікі бібліятэкі Разалія Герасімаўна Любіна, Анна Аронаўна Эвенчык і Марыя Іванаўна Паскрабаева закладвалі асновы кніжнага фонда. За прайшоўшыя дзесяць год у жыцці бібліятэкі, як і ўсяго універсітэта, адбыліся вялікія змены. Бібліятэка зараз займае адно з лепшых памяшканняў і налічвае звыш 225 тысяч тамоў кніг, абслугоўваючы да трох тысяч чытачоў. Работнікі бібліятэкі чула адносяцца да запатрабаванняў наведвальнікаў і заслужана карыстаюцца агульнай павагай студэнтаў.

Хто не ведае ў нас убеленую сівізнай Паліну Наумаўну Херузо? За дзесяць пасляваенных год яна выдала студэнтам дзесяткі тысяч кніг, пастаянна цікавіцца запатрабаваннямі наведвальнікаў. Сумленная работніца бібліятэкі, яна аддае ўсе свае сілы любімай справе.

Дзесяць год самааддана працуе ў дружным калектыве бібліятэкі О. Л. Ніканава.

Кніжныя вітрыны да юбілейных знамянальных дат, выстаўкі навінак, інфармацыйныя бюлетэні новых паступленняў, рэкамендацыйныя спісы літаратуры старанна падрыхтоўвае бібліятэкар Агнеса Сенкевіч.

Свой багаты вопыт ветэраны бібліятэчнай справы перадаюць маладым. Пад іх кіраўніцтвам К. Сасоўская, І. Іванічава, Я. Іваноўская праявілі сябе здатнымі бібліятэкарамі. Пяцігадовую выслугу ў бібліятэцы маюць В. Ананько, В. Палевіч і В. Цельпугова. Гэта сапраўдныя энтузіясты бібліятэчнай справы.

Сустракаючы Міжнародны дзень 8 сакавіка, калектыў бібліятэкі абавязуецца яшчэ лепш працаваць, няспынна задавальняць патрэбы чытачоў.

Э. ЮШКЕВІЧ.

НА КАРЫСЦЬ АЙЧЫННАЙ НАВУКІ

Вольгу Філіпаўну Якушка называюць ва універсітэце маладым вучоным. Але яе навуковыя працы набылі ўжо вядомасць за межамі нашай рэспублікі. Вольга Філіпаўна займаецца аўтарам шэрагу спецыяльных тэарэтычных работ. У той жа час яна нярэдка змяшчае артыкулы ў часопісы на самыя надзённыя пытанні. Вялікую ўдзячнасць выказваюць ёй школьныя настаўнікі і піонерважатыя за кнігу-дапаможнік «Падарожжы па роднаму краю». Вольга Філіпаўна сама шмат падарожнічала і цвёрда ведае, што выхаванне патрыятызму пачынаецца з паглыбленага вывучэння сваёй Радзімы. Высокародная мэта—прывіць дзецям любоў да роднага краю пастаўлена і вырашана ў яе кнізе

Вольгу Філіпаўну выхаваў наш універсітэт. Пасля заканчэння дзесяцігодкі яна паступае на геаграфічны факультэт. Прага да ведаў і вялікая працаздольнасць ужо тады вылучаюць студэнтку Якушка ў шэраг выдатнікаў. Не пакідае яна вучобы і ў час Вялікай Айчыннай вайны, калі Беларускі універсітэт быў эвакуіраван на станцыю Сходня Маскоўскай вобласці. А ўжо праз месяц пасля вызвалення роднага Мінска Вольгу Філіпаўну можна было бачыць разам з другімі студэнткамі на працы па аднаўленню



універсітэта, зруйнаванага фашысцкімі захопнікамі.

Як лепшую студэнтку, выявіўшую вялікую здольнасць да навуковай работы, Вольгу Якушка пакідаюць у аспірантуры. За выдатную вучобу і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці маладой аспірантцы і тут, як некалі студэнтцы, прысуджаюць сталінскую стыпендыю.

У 1949 годзе тав. Якушка з поспехам абараніла дысертацыю на тэму «Геамарфалогія Мінскага ўзвышша» і атрымала вучоную ступень кандыдата геаграфічных навук. З гэтага часу яна працуе дацэнтам на кафедры фізічнай геаграфіі нашага універсітэта. Адначасова з'яўляецца загадчыкам сектара гісторыі, геаграфіі і канстытуцыі ў навукова-даследчым інстытуце педагогікі.

Партыя забяспечыла жанчынам нашай краіны неабмежаваныя магчымасці ўсебаковага развіцця іх творчых здольнасцей. Выхаваная Совецкай Радзімай, Вольга Філіпаўна Якушка самааддана служыць свайму народу, развіваючы і ўзбагачаючы совецкую навуку.

І. ХАЎРАТОВІЧ.

Сумленныя працаўніцы

У аудыторыях біялагічнага корпуса яшчэ змрок. Хутка пачнуць сходзіцца студэнты. У гэты час прыбіральшчыцы заканчваюць уборку аудыторый і калідораў, расстаўляюць сталы і крэслы. Асабліва старанна працай адзначаецца прыбіральшчыца Наталля Несцераўна Камлёва. Задоўга да пачатку заняткаў у аудыторыях, замацаваных за ёй, прыбрана і праветрана, старанна пацёрты вокны. Сваімі рэўнаснымі адносінамі да працы Наталля Несцераўна заслужыла агульную павагу сярод адміністратыўна-гаспадарчых работнікаў. Прыбіральшчыца магадзяку ад рэктарата і атрымала прэмію за выдатную працу. І калі студэнты запаўняюць аудыторыі Наталля Несцераўна з радасцю адчувае, што ў іх паспяховай вучобе ёсць капля яе натхнёнай працы.

Не менш старанна працуе і прыбіральшчыца фізіка-матэматычнага корпуса Антаніна Іванаўна Чакатоўская. За ёй замацаван шэраг лабараторый. Прыбіральшчыцай яна працуе амаль тры гады, і за гэты час праца яе заўсёды вызначалася бездакорнасцю.

Міжнародны жаночы дзень Наталля Несцераўна і Антаніна Іванаўна сустракаюць з новым працоўным уздымам, з жаданнем аддаць усе свае сілы справе служэння Радзіме.

Я. КАРПОЎСКІ.

ПРЫКЛАДНЫ ТАВАРЫШ

Ніну Паўлаўну Пратасевіч ва універсітэце ведаюць як актыўнага самаадданага працаўніка. Яна загадвае аддзелам аспірантуры і адзіна галосна абрана старшынёй прафбюро адміністратыўна-гаспадарчай часткі універсітэта. Сваімі адносінамі да работы і актыўным удзелам у грамадска-палітычным жыцці універсітэта Ніна Паўлаўна паказвае прыклады нашаму калектыву.

Таго часу, як яна абрана старшынёй прафбюро, значна палепшылася работа асобных яго сектараў.

Тав. Пратасевіч чула і ўважліва адносіцца да запатрабаванняў работнікаў гаспадарчай часткі.

З. КОФМАН.

ДЭЛЕГАТ XII З'ЕЗДА ВЛКСМ

Яшчэ ў сярэдняй школе Майя Марчанка песціла думку: пасля заканчэння дзесятага класа паступіць на хімічны факультэт універсітэта.

І вось мара збылася: яна студэнтка.

Надоўга застаўся ў памяці той дзень, калі званок абвясціў першакурснікам аб пачатку першай лекцыі ў ВНУ, калі кожны з іх падумаў: «Вось ён—пачатак новага, цікавага жыцця».

Праз некалькі дзён на першым курсе хімфака адбыўся камсамольскі сход—выбіраўся комсорг. Цяпер цяжка ўспомніць, хто першы прапанаваў кандыдатуру Майі Марчанка але гэтая прапанова была дружна падтрымана ўсім курсам. Так дзяўчына з першых дзён вучобы ўлілася ў бурнае грамадскае жыццё.

З таго часу прайшлі два з лішнім гады. Цяпер Майя займаецца на III курсе і кіруе комсамольскай арганізацыяй факультэта.

У характары Майі ёсць рысы, якія ўласцівы лепшым комсамольскім важакам — высокае пачуццё адказнасці за даручаную справу і чулыя адносіны да таварышаў.

Многа клопатаў у сакратара комсамольскага бюро факультэта, і галоўны з іх—дабіцца, каб усе студэнты атрымалі цвёрдыя веды і сталі добрымі спецыялістамі. Майю часта можна бачыць у студэнтаў розных курсаў. Яе цікавіць усё, што адбываецца ў групах: як выпускаецца насценная газета, ці не

прапускаюць студэнты лекцый, як яны працуюць у лабараторыях і рыхтуюцца да семінараў, якая дапамога патрэбна комсамольцам з боку бюро. Неабходна паклапаціцца і аб культурным адпачынку студэнтаў. Майя імкнецца да таго, каб комсамольцы хімфака—будучыя спецыялісты — былі ўсебакова развітымі людзьмі.

На III курсе да сакратара падыходзіць групорг М. Некрасава.

— Хачу парадзіцца з табою наконт плана работы,—гаворыць яна.

Майя ўважліва праглядае план. У ім намечана правесці гутарку аб кампазітары Барадзіне, культпаход у кіно, тэматычны вечар «Комсамол — гэта маладосць міру» і іншыя мерапрыемствы.

— Добры план, — гаворыць Майя.—Але на мой погляд, патрэбна было-б правесці экскурсію ў карціную галерэю. Там многія студэнты яшчэ не былі.

Так у план работы ўносіцца новы пункт, які з задавальненнем падтрымліваюць усе комсамольцы.

Майя ўспамінае, што трэба канчаткова дамовіцца аб правядзенні дыспута па кнізе В. Пановай «Пары года» сумесна са студэнтамі літаратурнага аддзялення філфака. Яна ідзе ў біялагічны корпус і бачыць там вывешаныя аб'явы аб дні дыспута. Сустрэўшыся з членам комсамольскага бюро літаратурнага аддзялення Нікалаем Рожыным, Майя гаворыць з дакорам:

— Што-ж вы без нас усё рабіце? Самі ўжо аб'явы зрабілі, а нам нічога не сказалі.

— Толькі сёння вывесілі,—апраўдваецца Нікалай.—Цяпер хацеў да вас зайсці. Рыхтуйцеся, у канцы сакавіка правядзем.

Некаторы час яны гутараць аб тым, як лепш арганізаваць і цікавей правесці дыспут. Задаволеная рашэннем важнага пытання, Майя зноў ідзе на хімфак.

Комсамольцы хімфака адначасова могуць браць з Майі прыклад і ў вучобе. За тры гады ў яе заліковай кніжцы з'явілася толькі адна «чацверка». Астатнія адзнакі—«выдатна».

Як адна з лепшых комсамолак універсітэта, Майя Марчанка на Мінскай абласной комсамольскай канферэнцыі выбрана дэлегатам на XII з'езд ВЛКСМ.

З вялікай радасцю сустракае дзяўчына Міжнародны жаночы дзень—8 сакавіка. Пазнаёміўшыся са Зваротамі ЦК КПСС, Майя імкнецца адказаць на клопаты партыі і ўрада паспяховым авалодваннем ведамі і плённай грамадскай работай.

М. ПІЛЬШЧЫКАЎ.

УРАЧЫСТАЕ ПАСЕДЖАННЕ

7 сакавіка ва універсітэцкім клубе адбылося ўрачыстае паседжанне студэнтаў, навуковых супрацоўнікаў, рабочых і служачых універсітэта, прысвечанае Міжнароднаму жаночаму дню—8 сакавіка.

Даклад аб ролі совецкай жанчыны ў пабудове комуністычнага грамадства, аб укладзе жанчын у справу бараньбы за мір ва ўсім свеце зрабіла кандыдат філалагічных навук Н. Н. Багалюбава.

Прысутным быў паказан спектакль па п'есе Н. В. Гогаля «Рэвізор» у пастаноўцы тэатральнага калектыва універсітэта.

ЗАЎВАГІ ГЛЕДАЧА

„ВЫБАЧАЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА!“

Аб актуальнасці і мастацкіх вартасцях сатырычнай камедыі А. Макаёнка «Выбачайце, калі ласка!» многа гаварыць не прыходзіцца. Ужо той факт, што п'еса паспяхова ідзе ў тэатрах Масквы і іншых гарадоў Совецкага Саюза, гаворыць сам за сябе. Поспех п'есы не выпадковы. Ён абумоўлен навізною тэмы, смеласцю і прынцыповасцю, з якою аўтар яе вырашае.

Некалькі слоў хочацца сказаць аб пастаноўцы камедыі ў Беларускім Дзяржаўным тэатры імя Янкі Купалы.

Народны артыст СССР Г. П. Глебаў цудоўна выконвае ролю Гарошкі, старшыні калгаса «Партызан». Гэта жывы чалавек, літаральна выхаплены з гушчы жыцця. Кожнае яго слова, кожную яго рэпліку глядач сустракае вясёлым смехам. Гарошка запалоханы, ён цярпліва выконвае ўсе загады Каліберава, нават ідзе на падман дзяржавы. Але ўсё ж сваёй істотай, знешнім выглядам, сваімі паводзінамі ён пратэстуе. Глядач бачыць, што Гарошка не мае тых якасцей, якія неабходны сапраўднаму кіраўніку калгаса. Аднак гэта ў многім абумоўлена блізарукімі, антыдзяржаўнымі ўказаннямі Каліберава. І глядач спачувае Гарошку, жадае бачыць яго выправіўшымся.

Рад сумненняў і нараканняў выклікае вобраз калгасніцы Ганны Чыхнюк (народная артыстка БССР Л. І. Ржэцкая). Толькі цёплая і ўмелая ігра артысткі выратоўвае гэты вобраз. Падобныя персанажы сталі ўжо шаблоннымі, пераходзячымі з адной п'есы ў другую. Глядач параўноўвае развіццё характару Ганны з развіццём характараў у другіх, ужо прагледжаных ім п'есах і лёгка здагадваецца, як павінна паступіць гераіня. А разам з гэтым губляецца і цікавасць да развіцця вобраза. Ці не лепш было-б аўтару ўвесці ў п'есу 2—3 простых калгасніц, такіх-жа мэтанакіраваных, як і Ганна, так-жа хварэючых за свой калгас, але без усякіх рэгалій і без назойлівага падкрэслівання гераічнага мінулага гераіні.

Артыст Стома добра выконвае ролю райупаўмінзага Моцкіна. Ён удала паказвае ўменне апошняга абладжваць цёмныя справы, прыстасавацца, дзе неабходна, а дзе і выдаць шэраг «кіруючых указанняў».

Артыст П. І. Іваноў спадабаецца ў ролі дырэктара спіртзавода Печкурова. Людзі, падобныя Печкурову, з іх самазадаволенасцю, з іх спробамі пагрэць рукі ля дзяржаўнага дабра, яшчэ нярэдка сустракаюцца ў жыцці. Праўда, у іх некалькі іншы выгляд, часта іншыя паводзіны, у кішэні яны носяць не медыцынскую грэлку са спіртам, а самую звычайную бутэльку. Але некаторая гратэскнасць вобраза ў п'есе апраўдана, бо сатыра патрабуе завостранасці вобразаў. Але калі ў завостранасці вобраза Печкурова не адчуваецца фальшы, то вобраз жонкі Каліберава, Марыі Кірылаўны, з яе захапленнем катамі і кашачымі кандэртамі, яўна перавостраны і таму неперакананчы. Цяпер-жа не век старамодных дам, з іх кошкамі, сабачкамі, акварэлькамі. Такія жонкі адказных работнікаў, як Марыя Кірылаўна, ёсць яшчэ ў нашай совецкай рэчаіснасці. Іх абмежаванасць, унутраную апустошанасць іх агіднае нутро патрэбна выкрываць з усёй праматой і вастрынёй сатырычнага слова. Але для такога выкрыцця патрэбны некалькі іншыя сродкі.

Чалавеку, які мала знаёмы з тайнамі тэатральнага мастацтва, цяжка разабрацца ў трактоўцы вобраза адказнага раённага работніка Каліберава народным артыстам СССР Б. В. Платонавым. Аднак, адчуваецца, што артысту чагосьці нехапае, што не ўсе магчымасці для выкрыцця Каліберавушчыны выкарыстаны ім поўнасцю. На нашу думку, у ігры артыста пераважае станоўчы пачатак, які ідзе ад выканання Платонавым роляў станоўчых герояў. Каліберав-жа поўнасцю адмоўны тып. Гэта недалёкая пасрэднасць, якая пічыць сябе пакрыўджанай за перавод з Мінска на нізавую работу ў раён. Усё ў ім знешняе і паказное — і хвароба, выдуманая жонкаю, і хваляванне пасля атрымання партыйнага спагнання за правал хлебанарыхтовак, і абурэнне махінацыямі Моцкіна, аб якіх ён, дарэчы, не мог не ведаць. Каліберав рад патрэць рукі за кошт чужых намаганняў, але сам імкнецца выйсці з вады сухім, застацца ў баку.

XIX з'езд партыі асудзіў заганную практыку перавода з адной адказнай пасады на другую асоб, якія не справіліся з даручанай ім справай, заплямілі сваю рэпутацыю, зарэкамендавалі сябе авантурыстамі і шукальнікамі славы. Каліберав, трэба думаць, у ліку такіх асоб.

Некаторае недаўменне выклікае ў п'есе вобраз пракурора Курбатава (артыст В. І. Серпкоў). Хацелася-б, каб ён зрабіўся выражальнікам і выканаўцай волі мас, калгаснага сходу, які выкрывае і свайго старшыню, і цёмныя справы раённых кіраўнікоў.

Статычнай, патрэбнай толькі для таго, каб сабраць матэрыял для сатыры, з'яўляецца ў камедыі і роля карэспандэнта Гардзіюк (заслужаная артыстка БССР Л. С. Драздова). На сваёй прафесіі журналіст павінен актыўна ўмешвацца ў жыццё, выклікаць творчую актыўнасць мас. Уявіце сабе, што ў раён, які лічыцца па зводках перадавым, прыязджае карэспандэнт абласной газеты, каб расказаць аб вопыце работы раённых арганізацый. Карэспандэнт сустракаецца з людзьмі, гутарыць з імі, назірае і ўрэшце выяўляе, што справы ў раёне зусім не бліскучыя. Больш таго, тут пахне антыдзяржаўнымі прадзелкамі і махінацыямі. Усе акалічнасці спрыяюць таму, каб супрацоўнік газеты выступіў тут у якасці арганізатара грамадскай думкі. Карэспандэнт-жа ў п'есе толькі назірае. Літаральна ні ў чым не выяўляюцца яго адносіны да жыцця. І не варта было-б некагорым удзельнікам абмеркавання камедыі дзякаваць Макаёнка за стварэнне вобраза журналіста, які, на наш погляд, не зусім удалы і якому, наогул, адведзена ў п'есе другарадчае месца.

Дарэчы, некалькі слоў аб абмеркаванні камедыі, якое было арганізавана днямі праўленнем клуба. Гэтае абмеркаванне аказалася зусім непадрыхтаваным. Крыўдна было за універсітэт, соромна за арганізатараў абмеркавання. Хацелася сказаць ім: «Выбачайце, калі ласка, але абмеркаванне—справа сур'ёзная, адказная. Да яе патрэбна доўга і старанна рыхтавацца». Абмеркаванне павінна было дапамагчы гледачам разабрацца ў п'есе, дапамагчы аўтару выправіць недахопы, калі яны ёсць. Яно павінна было паказаць, наколькі адпавядае трактоўка вобраза аўтарскай задуме, калі ёсць разыходжанні, то наколькі яны мэтазгодныя, выйграе ці прайграе ад гэтага твор. Выступаючыя-ж з абмеркаваннем камедыі Макаёнка гаварылі аб усім—і аб мове п'есы, і аб літаратурных вартасцях твору, і аб вобразах. Забыліся толькі пра адно—пра ігру актораў. А гэта павінна было стаць галоўным прадметам абмеркавання.

У заключэнне хочацца парадавацца за беларускую драматургію, якая папоўнілася новым высокамастацкім творам. Сатырычная камедыя «Выбачайце, калі ласка»! — адказ нашых драматургаў на заклік партыі ствараць творы, вартыя пяра Гогаля і Шчэдрына. П'еса ў пастаноўцы тэатра імя Янкі Купалы радуе гледача, і ён пакідае залу ўдзячным і задаволеным.

Р. ПЛАТОНАЎ.

НЕ ДАПУСКАЦЬ ПАРУШЭННЯЎ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ

Амаль штодзённа, раніцай на другім паверсе біялагічнага корпуса універсітэта адзін і той-жа малюнак: студэнты біяфака разгубленна блукаюць па калідоры, недаверліва, па некалькі разоў заглядаюць у расклад заняткаў.

— Глядзі, Жэня,— узрушана гаворыць сяброўцы сінявокая дзяўчына, паказваючы вугалком канспекта на пустую графу расклада,— яшчэ ўчора вечарам тут стаяла «Фізіка глебаў», а сёння, бачыш, бурая пляма: ужо сцерлі!

Адразу бачна, што студэнты не ведаюць, чым яны павінны займацца і ў якой аудыторыі. У восьмай гадзіне на выручку прыходзіць сакратар біяфака Рэгіна Іосіфаўна Якубенка:

— Трэці курс! У вас зараз будзе глебазнаўства. Прафесар Мядзведзеў не з'явіўся: мабыць, зноў кудысьці адклікалі. Прыдзецца яго лекцыю перанесці на іншы дзень. Заходзьце зараз вось у гэтую аудыторыю.

Студэнты ў недаўменні толькі паціскаюць плячыма. Чуюцца галасы абурэння:

— Зноў гэтыя ператасоўкі!

— І калі гэта наш расклад усталяцца, каб можна было яму верыць?!

—Пачакайце, браткі, вось перад экзаменамі, напэўна, знойдуцца ўсе нашы выкладчыкі: вучэбны-ж план выконваць трэба. Вось тады будзе нам «весела»,— спрабуе жартаваць хтосьці.

Нарэшце ўсё сяк-так утрасаецца. Заняткі ў некаторых групах пачынаюцца з вялікім спазненнем і так амаль кожны дзень!..

Зараз на ўсіх курсах факультэта вельмі многа так званых «вокан». Студэнты часта вымушаны бяздзейнічаць. Вучэбны працэс з прычыны гэтага груба парушаецца.

Вучэбнай частцы універсітэта, напэўна, вядома, якая жорсткая і бязлітасная барацьба вядзецца на нашых прадпрыемствах—фабрыках і заводах—з усялякага роду прастоямі, з парушэннямі рытму вытворчых працэсаў, з штурмаўшчынай дзяржаўных вытворчых планаў у канцы месяца, дэкады, квартала, года? А ці-ж вучэбны працэс у ВНУ менш важны, чым вытворчы працэс прамысловага прадпрыемства? Калі не—дык чаму-ж у нас не вядзецца барацьбы з яго парушэннямі?

Я. СМОЛЬНЫ.

ЛЕПШЫЯ Ў СПОРЦЕ І ВУЧОБЕ

Ля ўвахода ў спартыўную залу Акруговага Дома афіцэраў, дзе праходзілі спаборніцтвы на першынство горада па баскетболу, Люда Старыкава, капітан універсітэцкай каманды, крыху сцішыла крок.

— Ну, дзяўчаткі, трымайцеся! Сёння ў нас сур'ёзны праціўнік, а выйграць трэба абавязкова,—звярнулася яна да сябровак. «Прыдзецца моцна трымаць абарону, быць больш акуратнымі пры падачы мяча, а ў нападзенні — больш імклівымі», — падумала Люда пра сябе і рашуча адчыніла дзверы.

Кожны, каму хоць аднойчы даводзілася наглядаць ігру жаночай баскетбольнай каманды універсітэта, з задавальненнем адзначаў прыгожую, знешне спакойную, але ўпэўненую ігру Люды Старыкавай. Капітан каманды, яна ў рашучы момант умела накіроўвае ігру, заспакойвае і падбадзёрвае сваіх сябровак.

Ва універсітэце Люду ведаюць не толькі як адну з вядучых спартсменак, але і як адну з лепшых студэнтак, выдатніцу вучобы. Паспяхова спалучаючы выдатную вучобу з заняткамі спортам, Люда не забываецца наведваць рэпетыцыі хора, добрасумленна выконвае грамадскія даручэнні. На ўсё ў яе хапае часу.

Аллу Караткевіч, студэнтку II курса фізмата, часта можна ўбачыць вечарам ў фізічнай лабараторыі, дзе яна працуе над матэрыялам на тэме «Поўправадніковыя лічыльнікі элементарных часціц», якую ўзяла ў студэнцкім навуковым гуртку.

Алла—адна з лепшых агітатараў універсітэта. Зараз, у перадвыбарчыя дні, ў яе асабліва многа работы, але Алла не забывае пра спорт і рэгулярна наведвае заняткі лыжнай секцыі. Настойлівая і ўпартая трэніроўка дала свае вынікі: у спаборніцтвах на першынство універсітэта Алла заняла I месца на дыстанцыі 5 км, паказаўшы лепшы час. Другі спартыўны разрад маецна і па гімнастыцы.

У складзе зборнай каманды рэспублікі, якая ездзіла ў Тбілісі на розыгрыш першынства краіны па баскетболу, мы з прыемнасцю адзначылі прозвішча Жэні Ермалаевай, студэнткі III курса хімічнага факультэта. Адна з лепшых студэнтак факультэта, Жэня карыстаецца павагай сваіх сяброў-аднакурснікаў. Сціплая, працалюбівая, яна заўсёды патрабавальна да сябе і да другіх, калі справа ідзе аб чэсці факультэта ці ў пытаннях вучобы, грамадскай работы, так і ў спорце.

— З тых пор, як Ермалаеву абралі ў бюро хімічнага факультэта і даручылі спартыўна-выхаваўчую работу, справы пайшлі значна лепш,— з задавальненнем адзначаюць студэнты хімфака.

Неаднаразова Жэні прыходзілася ўдзельнічаць у складзе зборнай каманды універсітэта ў спаборніцтвах на першынство горада па баскетболу і стралковаму спорту.

Такіх дзяўчат як Л. Старыкава, А. Караткевіч, Я. Ермалаева, якія паспяхова сумяшчаюць выдатную і добрую вучобу з паспяховымі заняткамі спортам, у нас ва універсітэце многа. Каля 250 студэнтак займаюцца ў розных спартыўных секцыях.

Пажадаем-жа ім у дзень 8 сакавіка яшчэ большых поспехаў у вучобе і спорце.

Н. УЛАДЗІМІРАВА.

НАЛАДЗІЦЬ РАБОТУ ГУРТКОЎ

Некаторыя навуковыя кіраўнікі гістфака забываюць пра тое, што навукова-даследчая работа —важны ўчастак выхавання студэнцкай моладзі. Напрыклад, кіраўнік гуртка гістарычнага матэрыялізма В. Н. Панкратаў да гэтага часу не распрацаваў тэматыку студэнцкіх навуковых работ.

Асобныя навуковыя гурткі існуюць толькі на паперы. Да іх ліку адносяцца гурткі гісторыі старажытнага свету (кіраўнікі тт. Нікольская і Нечай). У гэтых гуртках за ўвесь першы семестр быў прачытан толькі адзін даклад.

Вялікая віна за дрэнную работу гурткоў і іх кіраўнікоў кладзецца на грамадскія арганізацыі і Совет СНТ факультэта. Апошні сваё першае паседжанне правёў толькі ў канцы лютага.

Пакуль яшчэ ёсць час, неабходна наладзіць работу гурткоў, каб надрыхтаванымі прыйсці да універсітэцкага агляду студэнцкіх навуковых работ.

С. НІКАЛАЕВІЧ.

Рэдактар А. ВОЛК.

АТ 05220 Мінск друк. БДУ, універсітэцкі гарадок. Тыраж 1000 Заказ 172